(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 937.08 (021)

ЕЎТУХОЎ Ігар Арэставіч

# Познаантычны менталітэт
## (захад Рымскай імперыі IV – V стст. н.э.)

07.00.03 – усеагульная гісторыя

Аўтарэферат дысертацыі
на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук

Мінск – 2000

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Дысертацыя выканана на кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта

| | |
|---|---|
| Навуковы кансультант – | доктар гістарычных навук, прафесар Фядосік Віктар Анатолевіч |
| Афіцыйныя апаненты: | доктар гістарычных навук, прафесар Івонін Юрый Яўгенавіч |
| | доктар гістарычных навук, прафесар Аржахоўскі Ігар Вацлававіч |
| | доктар гістарычных навук Рассадзін Сяргей Яўгенавіч |
| Апаніруючая ўстанова – | Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт ім. М. Танка |

Абарона адбуд[illegible] 14 [illegible]
на пасяджэнні С[illegible]абароне дысертацый на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце
по адрасу: 220050, г. Мінск, пр. Скарыны, 4, ауд. 206
Тэл. вучонага сакратара – 226-55-38

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Аўтарэферат разасланы 28 снежня 2000 г.

Вучоны сакратар савета
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт А.А. Яноўскі

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

*Актуальнасць тэмы дысертацыі.* У апошнія дзесяцігоддзі ў замежнай і айчыннай гісторыяграфіі абазначылася і разгарнулася тэндэнцыя да гуманізацыі навукі. Тыя тэарэтычныя схемы развіцця познеантычнага грамадства, якія сфарміраваліся да гэтага часу, больш не задавальняюць шмат якіх даследчыкаў, таму, што яны не даюць ключа да разумення стэрэатыпу паводзінаў чалавека, успрыняцця ім прыроднага асяроддзя, не раскрываюць механізм узнікнення і развіцця ментальнасці.

Разам з тым, з улікам таго, што кола асноўных першакрыніц па гісторыі познаантычнага грамадства ўжо дакладна акрэслена і наўрад будзе значна пашырана ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі, узнікла відавочная патрэба ў замене метадалагічных падыходаў.

Менавіта ў выкарыстанні метада структурнага аналізу для разгляду шырокага кола першакрыніц па гісторыі познаантычнага грамадства і выхад, у выніку, на механізм фарміравання менталітэту, і бачыцца актуальнасць дысертацыйнага даследвання.

*Сувязь работы з буйнымі навуковымі тэмамі.* Асобныя сюжэты дысертацыйнага даследвання распрацоўваліся ў межах тэмаў навуковых даследванняў кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў Белдзяржуніверсітэта. Агульнатэарэтычнае разуменне ментальнасці і яго выяўленне ў перыяд позняй антычнасці разглядалася пры правядзенні работ па тэме «Даследаванне асноўных праблем старажытнаўсходняй, антычнай і сярэднявечнай гісторыі з пазіцый цывілізацыйнага падыходу (сацыяльна-палітычнае жыццё, ментальнасць, рэлігіі, культура цывілізацый старажытнасці і сярэднявечча)» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 19942335, выконвалася ад 01.12.1993 па 31.12. 1995). Падбор, пераклад і аналіз асноўных крыніц па тэме ажыццяўляўся пры правядзенні работ па тэме «Даследаванне асноўных крыніцазнаўчых праблем першакрыніц па гісторыі старажытных і сярэднявечных цывілізацый (класіфікацыя, аўтэнтычнасць, датыроўка, інфармацыя)» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 19963430, выконвалася ад 01.01.1996 па 31.12. 1998).

*Мэта і задачы даследвання.* Мэта дысертацыі – пры дапамозе структурнага падыходу да аналізу крыніц акрэсліць агульную структуру познаантычнай заходнееўрапейскай ментальнасці і механізм яе фарміравання. Для дасягнення мэты ў даследванні паслядоўна рашаліся дзве задачы: 1) аналіз самаўсведамлення чалавека па трох накірунках – нехрысціянскае, хрысціянскае (рымска-каталіцкае), хрысціянскае (альтэрнатыўныя), 2) аналіз успры-

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

няцця прыроднага асяроддзя (прасторы і часу) рымлянамі-хрысціянамі і рымлянамі-нехрысціянамі.

*Аб'ект і прадмет даследвання.* Аб'ектам дысертацыйнага даследвання з'яўляецца грамадства, якое склалася на тэрыторыі заходняй часткі Рымскай імперыі ў IV – V стст. н.э. Прадметам даследвання – менталітэт дадзенага грамадства, яго асаблівасці і механізм фарміравання.

*Гіпотэза.* Перыяд IV – V стст. у гісторыі познаантычнага грамадства выступае для заходнееўрапейскай цывілізацыі, як транзітыўны (пераходны) ад антычнага этапу да сярэднявечнага. У сувязі з гэтым традыцыйная рымская ментальнасць паступова страчвае свой уплыў і знікае, новая, рымскахрысціянская ментальнасць, зараджаецца, развіваецца і паступова пераходзіць у заходнееўрапейскі менталітэт ранняга сярэднявечча. Трансфармацыя менталітэту мае стадыяльны характар (першыя дзесяцціголдзі IV ст., другая палова IV ст., пачатак V ст.), прычым на кожным этапе дзейнічае механізм, які можа быць вызначаны праз апазіцыю «ўдакладненне – адсячэнне».

*Метадалогія і метады праведзенага даследвання.* Для аналізу падабраных матэрыялаў у дысертацыі выкарыстоўваецца метад структурнага аналізу, распрацаваны знакамітым рускім навукоўцам Уладзімірам Пропам. Асноўныя прынцыпы метада былі захаваны, але пры адпаведнай творчай перапрацоўцы, таму, што для сюжэтаў, звязаных з позняй антычнасцю, дадзеная метадалогія даследванняў выкарыстоўваецца ўпершыню.

*Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.* Навуковая навізна даследвання выяўляецца ў пастаноўцы праблемы, метадалогіі яе рашэння і атрыманых выніках.

Пры дапамозе метада структурнага аналізу пры разглядзе шырокага кола першакрыніц па гісторыі познаантычнага грамадства былі акрэслены асноўныя характарыстыкі познаантычнага менталітэту і механізм яго фарміравання. Падобны вынік атрыманы ўпершыню ў айчыннай і даступнай аўтару замежнай гісторыяграфіі.

*Практычная значнасць атрыманых вынікаў.* Матэрыялы і высновы дысертацыйнага даследвання могуць быць выкарыстаны пры аналізе менталітэту заходнееўрапейскага грамадства іншых блізкіх па часе эпох – Рымскай імперыі перыяду прынцыпату і Заходняй Еўропы перыяду ранняга сярэднявечча, пры распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гісторыі старажытнага Рыму і ранняга сярэднявечча для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцяў, а таксама пры падрыхтоўцы абагульняючых манаграфіяў па тэматыцы, звязанай з аналізам ментальнасці.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

*Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.* На абарону выносяцца наступныя палажэнні дысертацыйнага даследвання:

1. Агульная канцэпцыя чалавека перыяду позняй антычнасці можа быць сфармулявана наступным чынам: а) душа чалавека запэямлена ад нараджэння, б) яна імкнецца да паратунку, в) забяспечыць паратунак здольна толькі пэўная пасрэдніцкая структура паміж чалавекам і боскімі сіламі, г) мэта чалавека – самаўдасканаленне пры жыцці і больш дасканалае жыццё пасля смерці.

2. Асноўнай антрапалагічнай сістэмай у IV ст. стала рымска-хрысціянская ў варыянце, рэпрэзэнтаваным творамі Аўрэлія Аўгусціна – «бог – царква – чалавек – свет».

3. Пры вызначэнні жыццёвых арыенціраў месца рэалізацыі прынцыпаў старажытнарымскай доблесці заняў прынцып прыналежнасці да царкоўнай структуры.

4. Пры ўспрыняцці прыроднага асяроддзя адбыліся наступныя змяненні. Прыродна-сакральны космас традыцыйнага рымскага менталітэту саступіў месца хрысціянскаму сакральна-прыроднаму космасу. Пры ўспрыняцці часу адбылася яго сціскание. Базавай адзінкай пры гэтым становіцца не дзень, як раней, а гадзіна.

5. Трансфармацыя менталітэту мае стадыяльны характар (першыя дзесяцігоддзі IV ст., другая палова IV ст., пачатак V ст.), прычым на кожным этапе дзейнічае механізм, які можа быць вызначаны праз апазіцыю «ўдакладненне – адсячэнне».

6. Пасля вылучэння ў ментальнасці базавых канцэпцый чалавека паміж імі пачынаецца канкурэнтная барацьба за манапалізацыю ўплыву на аўдыторыю, у тым ліку пры ўспрыняцці прасторы і часу. Завяршаецца яна ўжо ў перыяд ранняга сярэднявечча перамогай рымска-каталіцкіх ідэолагаў.

*Асабісты ўклад саіскальніка.* Дысертацыя «Познаантычны менталітэт (захад Рымскай імперыі IV - V стст. н.э.)» ўяўляе сабой самастойнае навуковае даследванне. Дысертант падабраў, пераклаў на беларускую мову і прааналізаваў шырокае кола першакрыніц па даследуемай праблематыцы, шэраг з іх упершыню ўводзіцца ў навуковы абарот.

*Апрабацыя вынікаў дысертацыі.* Папярэднія і прамежкавыя вынікі дысертацыйнага даследвання паведамляліся навуковай грамадскасці на шэрагу міжнародных, агульнасаюзных, рэспубліканскіх, міжабласных, універсітэцкіх канферэнцыяў: VI Агульнасаюзныя Сяргееўскія чытанні (Масква, 1989) - «К вопросу об альтернативных антропологических системах поздней античности» (у сааўтарстве з В.І.Ханкевіч); канферэнцыя Ровенскага

аддзялення філасофскага таварыства СССР «Ленінская тэарэтычная спадчына і прагрэс сацыялізма» (Роўна, 1990) – «Формирование христианской концепции человека (антропология Киприана)» (у сааўтарстве з В.А.Фядосікам); VII Агульнасаюзныя Сяргееўскія чытанні (Масква, 1991) – «Исходные оппозиции позднеантичной антропологии (метод анализа)»; канферэнцыі Усерасійскай асацыяцыі антыказнаўцаў і часопіса «Вестник древней истории» «Асяроддзе. Асоба. Грамадства» (Масква, 1992) – «Формирование христианской концепции человека (западная апологетика)»; I Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы)» (Мінск, 1993) – «Станікейская канцэпцыя чалавека»; канферэнцыі Гданьскага універсітэта «Чалавек і прырода ў цывілізацыі старажытнай Грэцыі і Рыму» – «Człowek w czasie (na materiale łacińskiej poezji IV w.n.e.)» (Гданьск, 1996); II Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця» – «Крызіс свецкай кар'еры ў заходнерымскім грамадстве 2-й паловы IV ст.» (Мінск, 1997); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У.І.Пічэты «Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання» (Мінск, 1998) – «Гімны Амвросія Медыяланскага (структурны аналіз)»; рэспубліканскай канферэцыі «Лістападаўскія сустрэчы – 3: Чалавек і грамадства ў цывілізацыях старажытнасці і сярэднявечча» (Мінск, 1999) – «Маніхейская канцэпцыя чалавека»; канферэнцыі «Гістарычная навука і адукацыя ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў. Да 65-годдзя гістарычнага факультэта БДУ» (Мінск, 1999) – «Структурны падыход да аналізу познаантычных крыніц»; VI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 2000) – «Канцэпцыя чалавека ў "Бяседах" Іаана Касіяна (V ст.)».

*Апублікаванасць вынікаў.* Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследвання адлюстраваны ў 24 публікацыях, у тым ліку, у 2 манаграфіях, 10 артыкулах, 5 дакладах і 6 тэзісах дакладаў на навуковых канферэнцыях, 1 перакладзе з лацінскай мовы на беларускую. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 252 старонкі.

*Структура і аб'ём дысертацыі.* Дысертацыйнае даследванне складаецца з «Уводзінаў», «Агульнай характарыстыкі работы», чатырох раздзелаў, «Заключэння», «Спіса выкарыстаных крыніц». Агульны аб'ём тэкставай часткі дысертацыі складае 162 старонкі. Спіс выкарыстаных крыніц ахоплівае 227 назваў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**1. Структурны аналіз познаантычных крыніц.** Выкарыстаная ў дысертацыйным творы метадалогія даследвання арыентуецца на структурны аналіз познаантычных крыніц на мове арыгіналу (латынь). Падмурак яго складаюць наступныя ідэі: 1) вызнанне вербальнага фону крыніцы другасным адносна нейкай прыхаванай за ею структуры, 2) імкненне выйсці на апошнюю структуру, 3) імкненне прааналізаваць механізм, які падштурхнуў аўтара, ці аўтараў, да стварэння азначанага твору.

Рэалізацыя дадзенай метадалогіі пры аналізе заяўленай у даследванні тэмы патрабуе выканання наступных аперацый:

1) лакалізацыя матэрыяла ў часе і прасторы (позняя антычнасць, захад Рымскай імперыі), 2) вызначэнне асноўных антрапалагічных сістэм (рымская традыцыйная рэлігія, маніхейства, хрысціянства), 3) рэканструкцыя канцэпцыі чалавека ў кожным з накірункаў грамадскай думкі (увасабленне зыходнага варыянту ў канкрэтным інварыянце) і выхад на агульную канцэпцыю чалавека (зыходны інварыянт), 4) вызначэнне формулы, якая структурыруе інфармацыйную прастору (розныя спалучэнні базавых структурных элементаў: бог (богі), чалавек, свет), 5) вызначэнне мадэлюемага антрапалагічнай сістэмай стэрэатыпу паводзінаў, 6) выхад на познаантычную ментальнасць [14; 18; 23].

**2. Агульная канцэпцыя чалавека ў IV ст. н.э.** У выніку праведзенага ў даследванні аналіза канцэпцыяў чалавека рымскіх прыхільнікаў традыцыйнага веравызнання (Плацін), хрысціян (Кіпрыян, Афанасій Александрыйскі) і маніхеяў (Мані) можна акрэсліць кола антрапалагічных ідэй, вакол якіх фарміравалася большая частка канцэпцый чалавека ў першай палове IV ст.: 1) наяўнасць вышэйшай істоты; 2) душа чалавека заплямлена ад нараджэння, але імкнецца да бога (багоў); 3) паміж богам (багамі) і чалавекам ёсць пасрэднік; 4) мэта чалавека – самаўдасканаленне пры жыцці і больш дасканалае жыццё пасля смерці. Гэта кола ідэй вызначаецца як агульная канцэпцыя чалавека эпохі даміната, якая акрэслівае рамкі наступнага канцэптуальнага асэнсавання [13; 16; 17; 21].

У другой палове IV – пачатку V стст. у межах акрэсленых рамак пануючая роля ў антрапалагічных разважаннях належала хрысціянскай парадыгме, якая, пасля адпрацоўкі сістэм «бог – свет – чалавек, не патрэбны ані свету, ані богу» (Арнобій) і «бог – свет – чалавек, як вянец стварэння» (Лактанцый), выйшла на сістэму «бог – царква – чалавек – свет» (Аўрэлій Аўгусцін, Іаан Касіян) [3; 4; 5; 15].

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

У межах апошняй сістэмы адбываліся канцэптуальныя дыскусіі, якія набылі выгляд ерасяў (арыяне, пелагіяне, прэдэстынаты, цыркумцэліёны) [7; 6; 22].

**3. Стэрэатып паводзінаў у другой палове IV – пачатку V ст.** Тэксты прааналізаваных крыніц паказваюць, што стрыжнявым прынцыпам стэрэатыпу паводзінаў, прапанаваным канцэпцыяй чалавека, звязанай з традыцыйнай рымскай рэлігіяй, быў старажытны virtus. Стаўленне да яго з боку рымлян-нехрысціян размяркоўвалася па трох накірунках: 1) рэалізацыя, 2) квазі-рэалізацыя, 3) нуль-рэалізацыя. Пры гэтым для перыяду прынцыпата характэрна перавага першага накірунку (Плутарх) [8], для перыяду дамінату – другога (матэрыялы з перапіскі Квінта Аўрэлія Сімаха, Res gestae Аміяна Марцаліна, эпіграма Клаўдзія Клаўдзіяна пра веронскага старога) [10; 11; 12].

Падобная мадэль (рэалізацыя, квазі-рэалізацыя, нуль-рэалізацыя) прасочваецца і па рыма-хрысціянскаму матэрыялу, толькі ў якасці стрыжнявога прынцыпу выступае не virtus, а царкоўная структура [1, с. 81].

**4. Мадэлі прасторы і часу позняй антычнасці на лацінскім Захадзе.** Праведзены аналіз паказвае, што змяненні адбываліся не толькі ў самаўсведамленні чалавека, але таксама і ў успрыняцці прыроднага асяроддзя (прасторы і часу).

Рымляне, прыхільнікі традыцыйных вераванняў, бачылі вакол сябе прыродна-сакральны космас. Яго базавым элементам з'яўляўся Рым, якому лёсам было наканавана аб'ядноўваць усе народы, і які звязваў зямны і нябесны свет [9].

Рымляне-хрысціяне бачылі вакол сабе сакральна-прыродны космас, створаны і кіруемы богам. Рым пры гэтым звязваў свет зямны і нябесны праз свайго першага біскупа апостала Пятра [2, с. 77].

Пры ўспрыняцці часу рымляне-нехрысціяне арыентаваліся на адкрытую простую лінію, якая запаўнялася паслядоўнасцю «вялікіх гадоў». Гістарычны час рэгуляваўся фактарамі выпадковасці і ўпарадкаванасці. Будучыня развівалася па сцэнарнаму варыянту [20].

Рымляне-хрысціяне ўнеслі вельмі моцны сакралізуючы момант – замкнулі ўсе адрэзкі часу на богу. Цяпер яны выступалі ў якасці этапаў рэалізацыі боскага плана, зафіксаванага ў Бібліі. У выніку гістарычны час ператвараецца ў адрэзак, абмежаваны першым днём стварэння і ўсеагульным уваскрашэннем з апошнім судом [23].

**5. Трансфармацыя менталітэту.** Праведзены аналіз крыніц па гісторыі познаантычнай ментальнасці на Захадзе Рымскай імперыі ў другой па-

лове IV – пачатку V стст. дазваляе прапанаваць наступны механізм трансфармацыі познаантычнага менталітэту ў раннесярэднявечны.

Заходнееўрапейская позняя антычнасць можа быць вызначана як транзітыўны перыяд, звязаны са зменай дамінуючай антрапалагічнай сістэмы, калі фактар адкрытасці выконвае актыўна-стваральную, а фактар цэласнасці – актыўна-рэгулюючую функцыю.

Пад першым фактарам пры гэтым маецца на ўвазе ўнутраная дынаміка развіцця хрысціянскай антрапалогіі, звязаная ў тым ліку і з палемікай, накіраванай супраць схізматыкаў і ерытыкоў. Пад другім – базавая самаідэнтэфікацыя чалавека як рымляніна.

Па меры разгортвання першага фактару адбываецца паступовая трансфармацыя другога, адлюстраваннем чаго служыць уключэнне да складу агульнай сістэмы светабудовы царквы.

У выніку вернікам і патэнцыяльным будучым прыхільнікам хрысціянскага веравызнання прапаноўвалася дастаткова надзейная і моцная вонкавая апора ў жыцці. На карысць царквы спрацоўвала і яе падтрымка з боку дзяржавы, і тыражыруемы ею стэрэатып паводзінаў. Фактычна царква ператваралася ў стрыжань, вакол якога пачало арганізоўвацца сацыяльнае асяроддзе чалавека.

Працэс трансфармацыі менталітэту мае сваю стадыяльнасць, выхад на якую забяспечвае структурны аналіз крыніц. Вельмі ўмоўна асобныя этапы можна апісаць пры дапамозе апазіцыі «ўдакладненне – адсячэнне».

1. На пачатковым этапе, які ахоплівае першыя дзесяцігоддзі IV ст. удакладняюцца асноўныя параметры агульнай канцэпцыі чалавека, неабходнай грамадству і адсякаюцца тыя плыні, якія ім не адказваюць. У выніку гэтага актуальнасць захавалі погляды хрысціян, неаплатонікаў і маніхеяў.

2. Наступны этап ахоплівае другую палову IV ст. У гэты перыяд адбываецца пераход да больш дакладнай якаснай ацэнкі грамадствам актуальных антрапалагічных канцэпцый. Асноўным крытэрыем пры гэтым становіцца магчымасць іх суаднясення з рымскімі традыцыямі (удакладненне). Апошняе выпрабаванне не праходзяць маніхеі (адсячэнне).

3. У пачатку V ст. рэалізацыя апазіцыі «ўдакладненне – адсячэнне» адбываецца ў межах перамогшай хрысціянскай антрапалогічнай сістэмы ў выглядзе барацьбы з данатысцкім расколам і ерасямі арыян і пелагіян.

Завяршэнне трансфармацыі, як можна меркаваць, адносіцца да пачатку VI ст. Прыблізна ў 520 г. Фульгенцый з Руспэ пры падтрымцы паўночнаафрыканскіх епіскапаў і клірыкаў, якія хаваліся ў Сардыніі, пачаў палеміку супраць Фаўста Рэйнскага, лідэра масіліян, у абарону поглядаў

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

позняга Аўгусціна (прэдэстантызму). На саборы ў Аранжы ў 529 г., рашэнні якога былі падтрыманы папам рымскім Баніфацыем II, погляды Фаўста Рэйнскага падверглісь жорсткаму разбору і асуджэнню, дзеля захавання аўтарытэту Іпонскага епіскапа. Але такі жа самы лёс напаткаў і стрыжнявую ідэю прэдэстэнатаў пра наканаванне да граху. Адсячэнне крайніх поглядаў Фульгецыя і Фаўста захавала непахіснымі пануючае становішча масіліанства [23].

**6. Працэс манапалізацыі.** Пасля таго, як у выніку шматступнёвага працэсу «адсячэння – удакладнення» вылучаюцца базавыя антрапалагічныя сістэмы, якія прапануюць людзям адпаведныя механізмы арыянтацыі ў сацыяльным асяроддзі, паміж імі пачынаецца канкурэнтная барацьба за дасягненне максімальнага ўплыву на аўдыторыю.

Полем канкурэнтнай барацьбы становіцца ўспрыняцце прыроднага асяроддзя (прасторы і часу), асноўнай мэтай – манапалізацыя апошняга. Завяршаецца адзначаны працэс у перыяд ранняга сярэднявечча ўзнікненнем новых поглядаў на прастору і час.

Дастаткова паказальнымі ў гэтым плане ўяўляюцца пісьмовыя помнікі англасаксонскай Брытаніі: творы Беды Вельмішаноўнага «Царкоўная гісторыя народа англаў», «Пра часы», «Пра прыроду рэчаў», а таксама «Хроніка праўлення караля Альфрэда Вялікага» епіскопа Асерыя і «Арозій Альфрэда».

**7. Заходнееўрапейская мадэль прасторы ранняга сярэднявечча.** Беда Вельмішаноўны ў сваім не зусім арыгінальным творы «Пра прыроду рэчаў», які ў асноўных элементах паўтарае аналагічны трактат Ісідора Севільскага, фіксуе новы падыход да праблематыкі ўспрыняцця прасторы.

Сістэма сакральна-прыроднага космасу ўжо заняла вызначальнае месца ў менталітэце людзей таго часу, што дазваляла вывесці другую яе частку з ценю і перанесці на яе сэнсавы акцэнт. Як адзначыла перакладчыца твора на рускую мову Т.Ю. Барадай, Беду «значна менш цікавіла пытанне, што цікавага пісалі пра светабудову старажытныя (аўтары), і значна больш – як яно ўладкавана на самай справе». Пры гэтым, аднак, трэба ўлічваць, што творы антычных аўтараў Беда ведаў вельмі добра, у тым ліку і Макробія.

Свет быў створаны боскай дзейнасцю. Зямля – цэнтр космасу, які круціцца вакол яе. Больш дэталёва выкладзены ў Беды тэзіс Аўрэлія Аўгусціна пра анёлаў і дэманаў. Першых ён размяшчае на верхнім небе і дае ім магчымасць сыходзіць на зямлю ў эфірных целах, другія пакутуюць у паветры і могуць прымаць рознага кшталту паветраныя целы.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


Не выклікае ў Беды сумненняў і асобнае месца Рыма, як месцазнаходжання апостальскага трона. Праўда, ужо ў больш позніх часы цэнтр Зямлі перамяшчаецца на Усход – у Іерусалім.

Замагільны свет паступава пачынае набываць вертыкальную структуру: Рай – Пекла. Асаблівую ўвагу раннесярэднявечныя аўтары звярталі на тапаграфію замагільнага свету, які існаваў паралельна з рэальным.

Гэты сектар прасторы ў перыяд позняй антычнасці быў ледзьве абазначаны і меў несумненную патрэбу ў наступнай дэталізацыі. Значным крокам у адзначаным накірунку стала яго адкрыццё і ўсталяванне з ім зваротнай сувязі. Маюцца на ўвазе падарожжы туды душ жывых людзей і іх паспяховыя вяртанні ў целы сваіх гаспадароў, зафіксаваныя ў шматлікіх «бачаннях», два з якіх – Фурсы і Дрыктхельма – прыводзіць Беда.

Хоць сам жанр «бачанняў» не быў чужым і для антычнай традыцыі, яго сапраўдны росквіт прыпадае менавіта на сярэднявечча. Прычым асобныя творы гэтага кшталту шырока распаўсюджваліся практычна па ўсёй Заходняй Еўропе не толькі на лацінскай, але і на народных мовах. Прынамсі, «Бачанне рыцара Тнугдала» вядомае ў ірландскай, германскай, дацкай, французскай, англанармандскай і іспанскай версіях.

**8. Заходнееўрапейская мадэль часу ранняга сярэднявечча.** Рымахрысціянская мадэль позняй антычнасці атрымала наступнае развіццё ў перыяд ранняга сярэднявечча.

Паводле трактата Беды «Пра часы» асноўнымі адзінкамі яго вымярэння былі момант, гадзіна, дзень, месяц, год, стагоддзе, эпоха. Ноч пры гэтым дзялілася на 6 частак: змрок, вечар, маўклівасць, поўнач, час крыку пеўня, раніца.

Як можна меркаваць, адсутнасць у схеме Беды асобных тэрміналагічных вызначэнняў дзённых гадзін звязана з іх поўным пераходам пад царкоўны кантроль, прычым практычна на ўсё сярэднявечча. Выходзячы з інфармацыі Ж. Ле Гофа, узнікненне спецыяльнага часу для свецкага (па-за царкоўнага) адпачынку адносіцца толькі прыблізна да 1231 г.

Разыходжанні паміж тэрмінамі для вызначэння начных гадзін пасля поўначы: у Макробія – крык пеўня, маўчанне, золак, раніца, у Беды – крык пеўня, раніца, звязаны з падвойным успрыняццям ночы, якое зафіксавана ў гімнах Амвросія Медыяланскага [1. с.80 – 81].

Вельмі цікавае развіццё атрымлівае ў Беды і прапанаваная Аўрэліем Аўгусцінам схема руху чалавецтва ў гістарычным часе праз паслядоўнасць узростаў з адпаведным напаўненнем пэўнай колькасцю гадоў: 1) Адам – Ной, 10 генерацый, 1656 гадоў, 2) Ной – Аўраам, 10 генерацый, 292 гады, 3)

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


Аўраам - Давід, 14 генерацый, 942 гады, 4) Давід – перасяленне ў Вавілон, 14 генерацыяў, 473 гады, 5) да прыхода Выратавальніка, 14 генерацый, 589 гадоў, 6) сучаснасць. Агульная колькасць гадоў ад Адама да Хрыста па меркаванні Беды складае такім чынам усяго 3952 гады, у той час калі Іеронім Стрыдонскі настойвае на 5228 гадах.

Як уяўляецца, жорсткая арыентацыя Беды на схему Аўгусціна прывяла ў выніку да сціскання біблейскага часу. Шосты ўзрост ён вызначае ў 708 гадоў і пакідае такім чынам сучаснасці яшчэ 1340 гадоў існавання.

Падобны жа працэс сціскання біблейскага часу прасочваецца і ў шэрагу іншых англасаксонскіх крыніц. Асерый адзначае, што Альфрэд Вялікі нарадзіўся ў 849 г. ад увасаблення Хрыста і дае яго радавод да Адама, які налічвае 41 генерацыю. У той жа час Беда дае ад Адама толькі да Хрыста 62 генерацыі.

У «Арозіі Альфрэда», перакладзе гістарычнага твору Паўла Арозія, падрыхтаваным, магчыма, самім каралём Альфрэдам Вялікім, са старазапаветнай гісторыі фактычна знікла больш 200 гадоў. У арыгінальным тэксце пачатак збожжавага дабрабыту пры Іосіфе датуецца 1008 годам да заснавання Рыма, час сыхода яўрэяў з Егіпта пад кіраваннем Майсея – 805 годам да заснавання Рыма. У перакладзе першая дата даецца як 800 гадоў да заснавання Рыма, другая – як 805 гадоў.

Праблема з біблейскай часткай гісторыі чалавецтва была знята, як лічыць Джанет Батлі, спыненнем у раннім сярэднявеччы практыкі датавання падзей сучаснай гісторыі па шкале часу ад пачатку свету.

Такім чынам, усталяванне сувязяў паміж рымска-хрысціянскім менталітэтам позняй антычнасці і заходнееўрапейскім менталітэтам ранняга сярэднявечча дазваляе прасачыць паступовае вычляненне хрысціянскага свету з антычнага і атрымаць ключ да разумення працэсаў, якія адбываліся ў духоўным жыцці Заходняй Еўропы ў перыяд так званых «цёмных стагоддзяў» (VI – VII стст. н.э.).

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Манаграфіі


1. Еўтухоў І.А. Успрыняцце прасторы і часу ў познаантычным менталітэце. Мінск: БДУ, 1999. – 83 с.

2. Еўтухоў І.А. Канцэпцыі чалавека позняй антычнасці. – Мінск, 2000. – 83 с.


### Артыкулы


3. Евтухов И.О., Федосик В.А. К вопросу о формировании антропологии Аврелия Августина // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І.Леніна. Сер. 3. – 1988. – № 2. – С. 22 – 24.

4. Евтухов И.О. Концепция человека в произведениях Аврелия Августина периода Тагаста (388 – 389) // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І.Леніна. Сер. 3. – 1989. – № 2. – С. 18 – 20.

5. Евтухов И.О. «Энхиридион» Аврелия Августина и раннесредневековая концепция человека // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І.Леніна. Сер. 3. – 1991. – № 1. – С. 14 – 17.

6. Евтухов И.О. Концепция человека поздней античности (пелагиане) // Античность и средневековье Европы. Межвузовский сборник научных трудов. – Пермь, 1994. – С. 126 – 133.

7. Еўтухоў І.А. Прынцып усынаўлення ў раннеарыянскай канцэпцыі чалавека // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3. – 1994. – № 1. – С. 21 – 23.

8. Евтухов И.О. Плутарх Херонейский: жизнь и творчество // Плутарх Избранные жизнеописания. – Минск: «Беларусь», 1995. – С. 4 – 18.

9. Еўтухоў І. А. Вобраз Рыма ў познаантычным менталітэце (па творах Прудэнцыя і Намацыяна) // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3. – 1995. – № 2. – С. 16 – 19.

10. Еўтухоў І.А. Адлюстраванне познаантычнага менталітэту ў перапісцы Сімаха і Аўсонія // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3. – 1999. – № 2. – С. 29 – 31.

11. Еўтухоў І.А. Адлюстраванне познаантычнага менталітэту ў перапісцы Сімаха і Петронія Проба // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3. – 2000. – № 1. – С. 16 – 18.

12. Еўтухоў І.А. Адлюстраванне познаантычнага менталітэту ў перапісцы Сімаха і Прэтэкстата // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3. – 2000. – № 2. – С. 31 – 34.

Тэксты і тэзісы дакладаў

13. Евтухов И.О., Федосик В.А. Формирование христианской концепции человека (антропология Киприана) // Ленинское теоретическое наследие и культурный прогресс социализма. Тезисы конференции (март 1990). – Ровно, 1990. – С. 68 – 69.

14. Евтухов И.О. Исходные оппозиции позднеантичной антропологии // Седьмые Всесоюзные Сергеевские чтения на кафедре истории древнего мира исторического факультета МГУ // Вестник древней истории. – 1992. – № 4. – С. 213.

15. Евтухов. И.О. Формирование христианской концепции человека (западная апологетика) // Среда, личность, общество. Доклады конференции. – М., 1992. – С. 111 – 112.

16. Еўтухоў І.А. Старанікейская канцэпцыя чалавека (Афанасій Александрыйскі) // Ўсебеларуская канферэнцыя гісторыкау «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы)». Мінск, 3 – 5 лютага 1993 года. Ч. 2. Сусветная гісторыя. – Мінск, 1993. – С. 80 – 81.

17. Еўтухоў І.А. Канцэпцыя чалавека эпохі даміната (Ямвліх і Афанасій Александрыйскі) // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя у Рэспубліцы Беларусь. Новыя канцэпцыі і падыходы. У дзвюх частках. Частка I. Сусветная гісторыя. Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Мінск, 3 лютага 1993 года. – Мінск: «Універсітэцкае», 1995. – С. 27 – 30.

18. Еўтухоў І.А. Гімны Амвросія Медыяланскага (структурны аналіз) // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання. Мінск, 23 – 24 красавіка 1998 г. Матэрыялы да Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У.І.Пічэты. – Мінск: Белдзяржуніверсітэт, 1998. – С. 81 – 83.

19. Еўтухоў І.А., Фядосік В.А. Сярэднявечча ў кантэксце сусветнай гісторыі // Лістападаўскія сустрэчы – 2. Матэрыялы выкладчаска-студэнцкай канферэнцыі (Мінск, 13 – 14 лістапада 1997 г.). – Мінск: БДУ, 1999. – С. 46 – 49.

20. Еўтухоў І.А. Сцэнарнае ўспрыняцце часу ў познаантычным менталітэце (паводле аўтараў-нехрысціян) // Гістарычная навука і гістарычная

адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця. Матэрыялы II Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў. Мінск, 10 – 11 красавіка 1997 г. Мінск: БДУ, 1999. С. 241 – 242.

21. Еўтухоў І.А. Маніхейская канцэпцыя чалавека // Праблемы гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў. Матэрыялы навуковай рэспубліканскай канферэнцыі памяці акадэмікаў М.М.Нікольскага і У.М.Перцава 15 16 лістапада 1999 г. – Мінск: БДУ, 2000. – С. 29 – 33.

22. Еўтухоў І.А. Канцэпцыя чалавека цыркумцэліёнаў // Праблемы гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў. Матэрыялы навуковай рэспубліканскай канферэнцыі памяці акадэмікаў М.М.Нікольскага і У.М.Перцава 15 – 16 лістапада 1999 г. – Мінск: БДУ, 2000. – С. 143 – 146.

23. Еўтухоў І.А. Структурны падыход да аналізу познеантычных крыніц // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў. Матэрыялы Рэспубліканскай навуковапрактычнай канферэнцыі, прысвечанай 65-годдзю заснавання гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. 26 лістапада 1999 г., Мінск. – Мінск: [БДУ], 2000. – С. 382 – 386.

## Пераклады

24. Еўтухоў І.А. «Гісторыя» Аміяна Марцаліна пра аламанаў // Заходнееўрапейскае грамадства ранняга сярэднявечча. Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў гістарычнага факультэта. – Мінск: Белдзяржуніверсітэт, 1997. – С. 17 – 21.

# (ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## РЭЗЮМЕ

Еўтухоў Ігар Арэставіч. Познаантычны менталітэт (захад Рымскай імперыі IV – V стст. н.э.).

Ключавыя словы: позняя антычнасць, прастора, час, канцэпцыя чалавека, стэрэатып паводзін, менталітэт, структурны аналіз.

Аб'ект даследвання – грамадства, якое усталявалася на тэрыторыі заходняй частцы Рымскай імперыі ў IV – V стст. н.э.

Прадмет даследвання – менталітэт згаданага вышэй грамадства, яго асаблівасці і механізм узнікнення.

Лацінскія крыніцы былі вывучаны з дапамогай арыгінальнага метада структурнага аналізу, заснаванага на канцэптуальных падыходах знакамітага расійскага навукоўца Уладзіміра Пропа. Метад структурнага аналізу ўяўляе сабой шэраг паслядоўных аперацый даследчыка.

Навуковая навізна даследвання заключаецца ў самой пастаноўцы праблемы, метадалогіі яе вывучэння і атрыманных выніках.

У якасці вынікаў праведзенных даследванняў былі зроблены наступныя высновы: 1) канцэпцыя чалавека, якая актуалізавалася ў заходняй частцы чалавека, фарміравалася пад уплывам уяўлення пра сапсаванасць душы чалавека і імкнення людзей пераадолець адчужэння ад бога (багоў), 2) стэрэатып паводзін, прапанаваны ідэолагамі грамадства, рэалізоўваўся ў межах мадэлі, якая можа быць апісана пры дапамозе наступных тэрмінаў: «рэалізацыя», «квазі-рэалізацыя», «нуль-рэалізацыя», 3) пры ўспрыняцці прасторы ў менталітэце адзначаецца пераход ад прыродна-сакральнага да сакральна-прыроднага космаса, 4) пры ўспрыняцці часу ў ментальнасці прасочваецца яго сціскание (актуалізацыя дробных адрэзкаў часу), 5) працэс трансфармацыі рымскага менталітэта ў сваю познюю (і апошнюю) стадыю мае пэўныя этапы, якія можна апісаць пры дапамозе апазіцыі «ўдакладненне - адсячэнне».

Матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны для напісання агульных і спецыяльных курсаў лекцый, падручнікаў, манаграфій па гісторыі старажытнага Рыма.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## РЕЗЮМЕ

Евтухов Игорь Орестович. Позднеантичный менталитет (запад Римской империи IV – V вв. н.э.).

Ключевые слова: поздняя античность, пространство, время, концепция человека, стереотип поведения, менталитет, структурный анализ.

Объект исследования – общество, установившееся на территории западной части Римской империи в IV – V вв. н.э.

Предмет исследования – менталитет вышеупомянутого общества, его особенности и механизм формирования.

Латинские источники были проанализированы при помощи оригинального метода структурного анализа, основанного на концептуальных подходах знаменитого российского ученого Владимира Проппа. Метод структурного анализа представляет собой последовательный ряд операций, проводимых исследователем.

Научная новизна содержится в самой постановке проблемы, методе ее изучения и полученных результатах.

В результате проведенного исследования были сделаны следующие выводы: 1) концепция человека, ставшая актуальной в западной части Римской империи, формировалась под влиянием представлений об испорченности человеческой души и стремления людей преодолеть отчуждение от бога (богов), 2) стереотип поведения, предложенный идеологами общества, был реализован в тамках модели, которую можно описать следующими терминами: «реализация», «квази-реализация», «ноль-реализация», 3) при восприятии пространства в менталитете отмечается переход от природно-сакрального космоса к сакрально-природному, 4) при восприятии времени в менталитете прослеживается его сжатие (актуализация маленьких отрезков времени), 5) процесс трансформации римского менталитета в свою позднюю (и последнюю) стадию проходит определенные стадии, которые можно описать при помощи оппозиции «уточнение – отсечение».

Материал диссертации может быть использован при написании общих и специальных курсов, учебников, монографий по истории древнего Рима.

# (ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## SUMMARY

Yeutukhou Ihor Orestowich. The Mentality of Late Antiquity (the West of Roman empire IV – V c. A.D.).

Keywords: late antiquity, space, time, concept of person, stereotype of behaviour, mentality, structural analysis.

Object of study – society, established on the territory of western part of the Roman empire in IV – V c. A.D.

Subject of studies – mentality of the society, mentioned above, its particularities and mechanism of formation.

Latin sources had been studied with the help of original method of structural analysis, based on conceptual approaches by the famous Russian scientist Vladimir Propp. The method of structural analysis has the form of several steps, which researcher has to make one by one.

Scientific novelty of study is in the problem itself, methodology of its study and recieved results.

As a result of conducted studies the following conclusions were made: 1) the concept of person, which became actual in western part of Roman empire, was configured by the influence of imagination of corruption of people's souls and the aspiration of people to surmount its estranging from the god (gods), 2) stereotype of behaviour, proposed by ideologists of society, was realized within limits of model, which may be described with the help of following terms: "realization", "quasi-realization", "zero-realization", 3) at the perception of space in mentality a transition from natural-sacral to sacral-natural cosmos can be mantioned, 4) at the perception of time in mentality its compression (actualisation of small lengths of time) is tracked, 5) process of turning roman mentality in its late (and last) has determined phases, which can be described with the help of opposition "revision – a cutting off".

Material of the thesises can be used to writing of general and special courses of lectures, textbooks, monographs on histories of ancient Rome.